RESOLUTION/GEN/NR0/348/90/IMG/NR034890.pdf?OpenElement – Date of access: 18.04.2011.
5. Declaration on the Granting of Independence to Colonial Countries and Peoples, GA Res. 1514 (XV), 15th Sess. (1960) [Electronic resource] – Mode of access: http://daccess-dds-ny.un.org/doc/RESOLUTION/GEN/NR0/152/88/IMG/NR015288.pdf?OpenElement – Date of access: 18.04.2011.
6. Thornberry, P. International Law and Minorities / P. Thornberry. – L., 1991. – P. 111.
7. Gros, E. The Right to Self-Determination. – Implementation of United Nations Re solutions // N. UN Pub. 1980 (UN Sales E.79.XIX.5) [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.humanlaw.org/kashmirself.html – Date of access: 18.04.2011.
8. Журек, О. Н. Самоопределение народов в международном праве / О. Н. Журек // Советское государство и право. – № 10, 1990. – С. 99.
9. Черниченко, С. В. Теория международного права: в 2 т. Т. 2 – М.: Издательство «НИМП», 1999. – С.177.
10. Final report and recommendations, UNESCO, Paris 27-30 November 1989 [Electronic resource]. –Mode of access:http://unesdoc.unesco.org/images/0008/000851/ 085152eo.pdf – Date of access: 18.04.2011.

## Становішча сярэдняй адукацыі на акупіраваных польскімі войскамі беларускіх землях у 1919–1920 гг.

*Бароўская В. М., магістрант БДУ,*
*навук. кір. праф. Ладысеў У. Ф.,*
*д-р гіст. навук*

Характарызуючы становішча сярэдняй і вышэйшай адукацыі на беларускіх землях, акупіраваных польскімі войскамі, нельга адасабляць яго ад агульнай адукацыйнай палітыкі польскіх урадавых колаў. Але перанос вылучаных асаблівасцяў дадзенай палітыкі ў галіне пачатковай адукацыі на развіцце сярэдняй адукацыі прывядзе да скажэння гістарычнай рэчаіснасці.

Аналізуючы шматлікія статыстычныя дадзеныя адносна стану сярэдніх навучальных устаноў, нельга вылучыць пэўныя асаблівасці ў іх развіцці ў залежнасці ад тэрытарыяльнага размяшчэння. На ўсей тэрыторыі Генеральнага камісарыята ўсходніх зямель польскамоўныя сярэднія навучальныя ўстановы карысталіся ўрадавымі субсідыямі (11 з іх было цалкам прынята на дзяржаўнае ўтрыманне), непольскамоўныя ўстановы існавалі дзякуючы прыватнаму фінансаванню ці самафінансаванню.

Усяго на тэрыторыі Генеральнага камісарыята налічвалася 4 сярэднія навучальныя ўстановы з беларускай мовай навучання, у якіх на 1 настаўніка прыходзілася прыкладна каля 12 вучняў. З польскай мовай навучання — 36 сярэдніх навучальных ўстаноў, у якіх на 1 настаўніка прыходзілася — па 25 вучняў. На адзначанай тэрыторыі ў 1919–1920 гг. функцыянавала 53 рускамоўныя сярэднія навучальныя ўстановы, у якіх на 1 настаўніка прыходзілася па 21 вучню. З яўрэйскай мовай навучання дзейнічала 19 сярэдніх навучальных ўстаноў, у якіх на 1 настаўніка прыходзілася па 23 вучні [1, s. 245–251]. Як паказваюць лічбы, беларускамоўныя сярэднія навучальныя ўстановы былі малалікімі, не карысталіся вялікай папулярнасцю сярод мясцовага насельніцтва. Нявырашанасць палітычнага будучага гэтых зямель (прыналежнасць да пэўнага дзяржаўнага ўтварэння), распаўсюджанае меркаванне аб нізкім адукацыйным узроўні беларускамоўных сярэдніх навучальных устаноў, цяжкасці працаўладакавання — гэтыя прычыны прыводзілі да з'явы атрымання беларусамі па нацыянальнасці сярэдняй адукацыі ў рускамоўных і польскамоўных навучальных установах, якія былі больш распаўсюджанымі на беларускіх землях.

Назіралася стабільная тэндэнцыя перарэфармавання былых рускамоўных сярэдніх навучальных устаноў у беларускамоўныя. Польскі акупацыйны апарат кіравання заахвочваў такія пачынанні, асабліва на тэрыторыі Мінскай акругі. Асноўнай прычынай перарэфармавання гэтых навучальных устаноў было цяжкае матэрыяльнае становішча. Польскія ўлады не хацелі асігнаваць сродкі на адукацыю на рускай мове. «Перад рускамоўнымі школамі мы не маем ніякіх абавязкаў, ніякіх субсідый выдзяляць не будзем, — казалася ў дырэктыве Генеральнага камісара ў ліпені 1919 г. — Беларускім школам, калі маецца належная колькасць жадаючых вучыцца па-беларуску, неабходна выдзеліць грашовыя субсідыі. Яўрэйскім школам субсідыі таксама выдзяляцца не будуць» [1, s. 233].

Каб працягнуць сваю навучальную дзейнасць, адміністрацыя некаторых рускамоўных сярэдніх устаноў звярталася да Беларускай школьнай рады ў Мінску з просьбай аб вырашэнні пытання іх далейшай дзейнасці. Беларуская школьная рада абавязалася вырашыць гэтае пытанне перад польскімі ўладамі, але з умовай пераводу выкладання ўсіх дысцыплін у дадзенай гімназіі на беларускую мову і ўвядзення спецыяльных дысцыплін — беларусазнаўства, гісторыі і геаграфіі Беларусі. У выніку гімназіі станавіліся беларускімі і атрымоўвалі субсідыі ад Беларускай школьнай рады. Такім чынам былі перарэфарміраваны Слуцкая і Нясвіжская гімназіі [2, л. 10]. Сярод сярэдніх навучальных устаноў найбольш шырока былі прадстаўлены прагімназія і гімназія. Добрым прыкладам тагачаснай гімназіі з'яўляецца Мінская Беларуская гімназія, якая дзейнічала ў рамках 8 класаў. Дзейнасць гімназіі праходзіла пад наглядам польскай

адміністрацыі. З патрэбных на першае паўгоддзе 102 тысяч марак было выдаткавана 15 тысяч марак.

Неабходна адзначыць некалькі незаконных актаў, здзейсненых польскімі акупацыйнымі ўладамі. Афіцыйна прызнаючы існаванне непольскамоўных прыватных сярэдніх устаноў на тэрыторыі Генеральнага камісарыята, яны на практыцы забаранялі функцыянавання такіх навучальных устаноў. Гэты лес напаткаў Будслаўскую гімназію, якая ў верасні 1919 г. была зачынена, а яе маемасць была рэквізавана ці разграблена, і на яе месцы была ўтворана польская гімназія [3, с. 7].

Такім чынам, становішча сярэдняй адукацыі падчас польскай акупацыі 1919–1920 гг. характарызуецца складанасцю і супярэчнасцю. Пераважная большасць непольскамоўных навучальных устаноў сярэдняга ўзроўню функцыянавала прыватным чынам. Малалікія беларускамоўныя навучальныя ўстановы не карысталіся вялікай папулярнасцю сярод мясцовага насельніцтва.

**Літаратура**

1. Gierowska-Kałłaur, J. Zarząd cywilny ziem wschodnich (19 lutego 1919 — 9 września 1920) / J. Gierowska-Kałłaur. — W-Wa: Neriton: Instytut Historii PAN, 2003. — 447 s.

2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. — Фонд 604. — Воп. 1. — Спр. 3. Переписка с секцией Просвещения Минского магистрата об обучении на белорусском языке в школах. — 485 л.

3. Школьная Рада // Беларусь. — 1920. — №10 (14 студзеня).

## Антикризисная стратегия правительства ФРГ в социальной сфере в период мирового экономического кризиса 2008–2010 гг.

*Бурдина Н. С., студ. IV к. БГУ,*
*науч. рук. проф. Шарапо А. В.,*
*д-р ист. наук*

В Германии действует социальная рыночная экономика, что означает: государство гарантирует свободу действий в экономической сфере, но старается добиваться социального баланса. Благодаря этой концепции, здесь — даже в экономически трудные времена — царит довольно прочный социальный мир, о чем свидетельствуют и чрезвычайно редкие забастовки.